ПАЛАЖЭННЕ

аб правядзенні абласнога этапу Рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў “Жывая класіка”

1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзенае Палажэнне вызначае мэты і задачы Рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў “Жывая класіка” (далей – Конкурс).

1.2 Конкурс распрацаваны ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку правядзення рэспубліканскіх мерапрыемстваў установамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з удзелам навучэнцаў, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 06.07.2011 №59.

1.3. Заснавальнікамі Конкурсу з’яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, ЗАТ “Сталічнае тэлебачанне”, ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”.

1.4. Конкурс праводзіцца ў мэтах: павышэння цікавасці дзяцей і падлеткаў да чытання; развіцця і захавання высокіх маральных каштоўнасцяў і ідэалаў беларускага грамадства; выхавання падрастаючага пакалення на лепшых узорах нацыянальнай літаратуры; прыцягнення ўвагі грамадскасці да праблематыкі чытання; пашырэння чытацкага кругагляду; пошуку і падтрымкі таленавітай моладзі.

1.5. Конкурс прысвечаны Году якасці.

1.6. Конкурс праводзіцца сярод навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, наступных узроставых груп: 1-4 класы ; 5-6 класы; 7-8 класы і 9-10 класы.

1.7. У склад журы Конкурсу на ўсіх этапах ўваходзяць вядомыя дзеячы культуры і мастацтва, настаўнікі, бібліятэкары, пісьменнікі, прадстаўнікі грамадмкіх арганізацый і аб’яднанняў.

1.8. Конкурс праводзіцца ў пяць этапаў у адпаведнасці з праграмнымі патрабаваннямі.

2. ЭТАПЫ КОНКУРСУ

2.1 Першы этап (адборачны) праводзіцця з 2 мая па 20 мая 2024 года ва ўстановах агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Колькасць удзельнікаў не абмяжоўваецца, пераможцы прымаюць удзел у раённым этапе Конкурсу.

Удзельнікі выконваюць два розных па жанры і тэматыцы творы. Агульная працягласць выступлення – 6 хвілін. Творы і манера выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка.

2.2. Другі этап (раённы) – праводзіцца раённымі ўстановамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з 20 па 27 мая 2024 года. Пераможцы раённага этапу Конкурсу, заняўшыя першыя месцы ў кожнай ўзроставай групе, прымаюць удзел у абласным этапе Конкурсу.

Удзельнікі выконваюць два розных па жанры і тэматыцы творы. Агульная працягласць выступлення – 6 хвілін. Творы і манера выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка.

Арганізатарам раённых этапаў неабходна да 27 мая 2024 года даслаць на абласны этап агульную заяўку (дадатак 2) з сылкай на відэазапіс выступленняў канкурсантаў, маніторынг, пратакол паседжання журы ад раёна (горада) на электронную пошту cmt@brest.by з пазнакай "Жывая класіка" для аддзела мастацкай творчасці".

2.3. Трэці этап (абласны) – праводзіцца установай адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці" 28 мая 2024 года ў дыстанцыйнай форме.

Удзельнікі выконваюць два розных па жанры і тэматыцы творы. Агульная працягласць выступлення – 6 мінут. Творы і манера выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка.

Пераможцы абласнога этапу Конкурсу ў кожнай узроставай групе прымаюць удзел у паўфінале.

2.4. Паўфінал (чацверты этап) праводзіцца ў чэрвені 2024 года арганізатарамі Конкурсу. Пераможцы паўфіналу прымаюць удзел у фінальным этапе.

Удзельнікі выконваюць адзін з твораў 3 этапа. Агульная працягласць выступлення – да 4 хвілін. Творы і манеры выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельнікаў.

2.5. Пяты этап (фінал) праводзіцца арганізатарамі Конкурсу ў рамках мерапрыемстваў Дня беларускага пісьменства. У фінале прымаюць удзел пераможцы паўфіналу. Удзельнікі выконваюць адзін твор. Агульная працягласць выступлення – да 4 хвілін. Творы і манеры выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельнікаў

3. КРЫТЭРЫІ АДЗНАКІ.

Конкурсныя выступленні ацэньваюцца адпаведна з крытэрыямі:

| № п/п | Крытэрыі адзнакі журы | Балы |
|---|---|---|
| 1 | Узровень выканальніцкага майстэрства | ад 0 да 10 |
| 2 | Выбар тэксту | ад 0 да 10 |
| 3 | Пачуццё жанравай асаблівасці | ад 0 да 10 |
| 4 | Творчы пантэцыял | ад 0 да 10 |
| | Максімальная колькасць балаў 40 | |

4. УЗНАГАРОДЖВАННЕ.

4.1 Усе ўдзельнікі фінала ўзнагароджваюцца дыпломамі Конкурсу, дыплома пераможцаў першай, другой і трэцяй ступеняў адпаведна і каштоўнвмі падарункамі ад заснавальнікаў Конкурсу.

4.2. Пераможцы абластнога этапу Конкурса узнагароджваюцца дыпломамі першай, другой і трэцяй ступеняў галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама. Усе ўдзельнікі паўфіналу Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэатаў конкурсу, дыпломамі пераможцаў першай, другогой і трэцяй ступеняў адпаведна і каштоўнымі падарункамі ад заснавальнікаў Конкурсу.

4.3. Пераможцы фіналу Конкурсу ўзнагароджваюцца пуцёўкай у Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр “Зубронак”.

5. ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

5.1 Этапы правядзення Конкурсу шырока асвятляюцца ў сродках масавай інфармацыі.

5.2. Інфармацыйнымі партнёрамі Конкурсу з'яўляюцца: “Выдавецкі дом “Звязда”, часопісы “Вясёлка”, “Бярозка”, “Качели”, “Зорька”, “Рюкзачок” і іншыя СМІ (па ўзгадненню з заснавальнікамі).

5.3. На працягу правядзення этапаў Конкурсу здымаюцца сюжэты і дэманструюцца ў эфіры нацыянальных і рэгіянальных тэлеканалаў. Тэлеверсія фіналу Конкурсу транслюецца асобнай праграмай у эфіры ЗАТ “Сталічнае тэлебачанне”.

6. ФІНАНСАВАННЕ

6.1. Фінансаванне Конкурсу забяспечваецца заснавальнікамі Конкурсу за кошт бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў.

6.2. Могуць выкарыстоўвацца іншыя крыніцы фінансавання ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Дадатак 2

Заяўка на ўдзел
у Рэспубліканскім творчым конкурсе юных чытальнікаў “Жывая класіка”

| №п/п | Узроставая катэгорыя | Прозвішча, Імя, Імя па бацьку | Назва ўстановы | Прозвішча, Імя, Імя па бацьку педагога, кантактны тэлефон | Аштар і назва твора | Спасылка на відэа |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1-ая узроставая катэгорыя | | | | | | |
| 1-ая узроставая | | | | | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| катэгорыя | | | | | | |
| 1-ая узроставая катэгорыя | | | | | | |
| 1-ая узроставая катэгорыя | | | | | | |

| Маніторынг удзелу ў Рэспубліканскім творчым конкурсе юных чытальнікаў “Жывая класіка” | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Раённы (Гарадскі) | Колькасць удзельнікаў | Колькасць аб’яднанняў па і нтарэсах (з іх устаноў дадатковай адукацыі) | Колькасць устаноў адукацыі (з іх устаноў дадатковай адукацыі) | | |